Тематический выпуск «Сад и огород» стр. 14

ЗАРЯ
БРЕСТСКАЯ ОБЛАСТНАЯ ГАЗЕТА НЕДЕЛЬНЫЙ ТИРАЖ 20905
5 сентября 2018 года СРЕДА, № 92 (15159) Цена договорная WWW.ZARYA.BY

## У телевизора

ТВ-программа на неделю



стр. 7 - 10, 15 - 17

ПАДЗЕЯ

# «Каб захаваць самабытнасць»



Фота Валерыя КАРАЛЯ

## Як у Іванава прайшло свята беларускага слова

**Сталіцай юбілейнага, дваццаць пятага, Дня беларускага пісьменства сёлета стаў горад Іванава. Раней прымаць у сябе свята такога высокага ўзроўню тройчы выпадала раённым цэнтрам Брэстчыны: у 1999 годзе свята праходзіла ў старажытным Пінску, у 2005-м яно сабрала гасцей у Камянцы, сем год таму Дзень беларускага пісьменства прайшоў у Ганцавічах.**

Іванава для правядзення гэтага грандыёзнага мерапрыемства было абрана невыпадкова – літаратурная біяграфія раёна багатая на выдатных дзеячаў і асоб, якія пакінулі адметны след у гісторыі айчыннага і сусветнага пісьменства і мастацтва. Скульптуры некаторых знакамітых людзей: Яна Пратасовіча, Змітро Віталіна, Марыі Саковіч, Фёдара Дастаеўскага, Марыі Бутаўт-Андрайковіч, Анатоля Рубановіча, Францішка Бруздовіча, Аляксея Каўко, якія праславілі Іванаўшчыну ў розныя эпохі, былі выраблены падчас XV абласнога пленэру разьбяроў манументальнай скульптуры і ўсталяваны ў гарадскім парку. Таксама важнаю была праведзеная напярэдадні рэспубліканская навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да Святыняў» з Благадатным Агнём ад Гроба Гасподня, а яшчэ ўрачыстыя мерапрыемствы 1 верасня – школьная лінейка ў СШ №4 г. Іванава, прысвечаная Дню ведаў «Пісьменства і друк Беларусі – крыніца культуры і духоўнасці народа» з удзелам высокіх гасцей, адкрыццё кніжнага магазіна «Верасень», гашэнне маркі і паштовага канверта, прысвечаных XXV Дню беларускага пісьменства, Міжнародны круглы стол «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго» з удзелам больш як сарака вядомых беларускіх і замежных літаратараў, выстаўка «Беларускі буквар: сувязь пакаленняў», прысвечаная 400-годдзю першага ў свеце выдання пад назвай «Буквар», навукова-практычная канферэнцыя «Іванаўскія чытанні», творчы конкурс юных чытальнікаў «Жывая класіка», тэатралізаванае прадстаўленне «Запрашаем да Мэйты» (*Мэйта – лабурская мянушка.* – **Заўв. аўтара**), этнадыскатэка «Палескія вытылінгічы».

*Заканчэнне на 4-й стар.*

## Праздник в Ленинском

Школа встретила первоклашек



стр. 3

## Ожидается аншлаг

Что посмотреть на «Белой веже»?



стр. 13

## Аккумуляторный завод

Как идет строительство?



стр. 18 - 19

ПРЯМАЯ ЛИНИЯ



## На вопросы – компетентно

**8 сентября с 9.00 до 12.00** состоится прямая телефонная линия с управляющим делами Брестского областного исполнительного комитета **Георгием Николаевичем ХВАЛЬКО**.

Волнующие вопросы можно задать по телефону в городе Бресте (8-0162) **21-31-21**.

Брест-ВТИ ОАО «Брест-ВТИ»
Автоматизация торговли
• Фискальные регистраторы, работающие с СКНО
Тел.: 8-0162-46-05-51,
8-0165-32-40-52,
8-0163-42-36-49.
УНП 200002340 опт

В редакции газеты «Заря»
МОЖНО ИЗДАТЬ
книги, брошюры, буклеты, другую печатную продукцию.
20-19-19
Приглашаем к сотрудничеству
заинтересованных лиц, предприятия и организации, творческие союзы и общественные объединения.
Свидетельство о регистрации в Государственном реестре издателей, изготовителей и распространителей печатных изданий Республики Беларусь в качестве издателя № 1/45.

Более 2 окон – ОТКОСЫ В ПОДАРОК
ОКНА
Раздвижные балконы
А также ОКНА
brusbox REHAU
SALAMANDER
8(029) 524-11-11, 8(029) 808-01-60
РАССРОЧКА, КРЕДИТ, ХАЛВА zaoknom.by
ИП Бутымов В.А. УНП 290963437

ПАДЗЕЯ

# Каб захаваць самабытнасць









*Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.*

За некалькі гадзін да галоўнай дзеі, афіцыйнай цырымоніі ўрачыстага адкрыцця Дня беларускага пісьменства, каля гарадской СШ №4 быў пасаджаны Сад Малітвы, а пасля ў Храме Пакрова Прасвятой Багародзіцы адбылася Літургія з перадачай Благадатнага Агню ад Гроба Гасподня на лампадкі і свечкі прыхаджан, на пешаходнай вуліцы 17-га Верасня, што ў цэнтры горада, адкрылі памятны знак «Янава слова», прысвечаны Дню беларускага пісьменства ў Іванаве. Скульптурная кампазіцыя ў выглядзе сонечнага гадзінніка, галоўны элемент якога – замацаванае ў мармуравай чашы пяро, праца калектыўная. Яе аўтарамі з'яўляюцца Алеся Шаціла, Аляксей Сарокін і Ганна Багаткіна (г. Мінск).

Безумоўна, самы чаканы момант для шматлікіх гасцей і жыхароў Іванава – урачыстае адкрыццё XXV Дня беларускага пісьменства. Словы бяруць запрошаныя на сцэну намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Ігар Петрышэнка, міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Карлюкевіч, старшыні Брэсцкага аблвыканкама Анатоль Ліс і Іванаўскага райвынкама Юрый Бісун, Уладыка Веніямін, епіскап Барысаўскі і Мар'інагорскі. Пра важнасць правядзення Дня беларускага пісьменства гаварылася ў прывітальным адрасе Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, дзе адзначалася, што гэтае свята – знакавая падзея ў жыцці Беларусі, сведчыць пра красу і сілу беларускай мовы, духоўныя традыцыі беларускага народа. «Многія стагоддзі пісьмовае слова перадае з пакалення ў пакаленне вечныя ідэалы прыгажосці, дабра і справядлівасці, з'яўляецца надзейным спадарожнікам кожнага чалавека на яго жыццёвым шляху. Святкуючы Дзень беларускага пісьменства, мы аддаём даніну павагі ўсім тым, хто стварыў нашу культуру, садзейнічаў асвеце і ўзняў на высокі ўзровень беларускае мастацкае слова. Продкі пакінулі нам неацэнны скарб – родную мову, выдатнымі ўзорамі якой з'яўляюцца творы Францішка Багушэвіча і Максіма Багдановіча, Янкі Купалы і Якуба Коласа, Уладзіміра Караткевіча і Івана Мележа. Кіраўнік краіны выказаў упэўненасць у тым, што, зберагаючы спадчыну гэтых і іншых знакамітых майстроў слова, сённяшняе пакаленне беларусаў сваёй плённай стваральнай працай будзе ўмацоўваць суверэнітэт і незалежнасць Радзімы».

Кіраўнік Брэсцкай вобласці Анатоль Ліс падзякаваў за магчымасць правядзення юбілейнага свята на гасціннай прыпяцкай зямлі, дзе жывуць таленавітыя і працалюбівыя людзі, якія і надалей будуць прымнажаць здабыткі ў розных сферах жыцця.

Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі таксама накіраваў пасланне, у якім павіншаваў усіх беларусаў з гэтым агульнанацыянальным святам, якое звяртае ўвагу на гістарычныя карані беларускага народа, на неацэнную духоўную спадчыну, якую павінен паважаць і ў меру сваіх магчымасцяў прымнажаць кожны патрыёт Беларусі. Найлепшым доказам шчырай любові сучаснікаў да яе была








мастацка-тэатралізаваная дзея «Малой радзіме пакланюся» з удзелам як шматлікіх заслужаных творчых калектываў і вядомых зорак нашай эстрады – ансамбля народнай музыкі «Бяседа», вакальна-інструментальнага ансамбля «Беларускія Песняры», ансамбля народнай музыкі і песні «Палешукі», тэатра народнага гумару «Лабуры», Ірыны Дарафеевай, заслужанага аматарскага калектыву «Фіеста» (г. Баранавічы), Ірыны Відавай, так і пачынаючых артыстаў гурта «PROвокация», Дзяніса Вакера і іншых. Сюрпрызам мерапрыемства ад арганізатараў стаў імправізаваны «масток», які злучыў розныя часавыя вымярэнні – Мінулае, Сучаснасць і Будучыню. Ад гармоніі дадзеных часавых адрэзкаў у розных галінах жыцця чалавека залежыць перспектыва існавання пэўнага народа – гэтую думку можна пакласці ў аснову многіх праектаў і мерапрыемстваў, што былі арганізаваны 2 верасня ў Іванаве: гэта і праца шматлікіх павільёнаў «Кнігі і прэса Рэспублікі Беларусь», «Добрая кніга – дзецям»; выставак галаграм старадрукаў з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, абласных і раённых СМІ, прымеркаваных да юбілейных дат з дня нараджэння вядомых беларускіх пісьменнікаў – А. Міцкевіча, В. Дуніна-Марцінкевіча, М. Гарэцкага, Я. Маўра, С. Грахоўскага, Н. Мацяш, Я. Янішчыц, ці выхаду зборнікаў класікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа; прэзентацыі турыстычнага патэнцыялу нашай вобласці.

Хвалюючым момантам стала ўзнагароджанне пераможцаў «Нацыянальнай літаратурнай прэміі» за 2017 год. Лепшымі сталі творы Казіміра Камейшы, Георгія Марчука, Зінаіды Дудзюк, Івана Штэйнера, Вольгі Нікольскай и Юліі Алейчанка.

Доўгачаканы падарунак атрымалі пачынаючыя спартсмены – для іх у гарадскім парку з'явілася новае міні-футбольнае поле. Для аматараў духавой музыкі выпала магчымасць паслухаць канцэрт выканаўцаў XXII абласнога свята-конкурсу «Фанфара-2018». Па сутнасці, кожны чалавек на свяце мог знайсці і набыць сабе нешта памятнае і патрэбнае: магніт альбо карціны, выкананыя ў розных тэхніках, бондарскі выраб ці саматканы ручнік, адзенне, дзіцячыя цацкі, упрыгажэнні і г.д. – горад майстроў здзіўляў разнастайнасцю і багаццем тавараў. Таксама можна было паспрабаваць як традыцыйныя стравы беларусаў, літоўцаў, так і адмысловую, лабурскую кухню: другія стравы, напоі і салодкія вырабы часткі янаўцаў, якія ў мінулым займаліся збіраннем ахвяраванняў на царкву.

Заключным акордам Дня беларускага пісьменства стаў канцэрт майстроў мастацтваў «Льецца песня над Палессем» з перадачай на ім эстафеты гэтага вялікага літаратурнага фэсту гораду Слоніму (Гродзенская вобласць). У першыя вераснёўскія выхадныя наступнага года чарговы Дзень беларускага пісьменства адбудзецца менавіта там. Наяўнасць жа свята, у сваю чаргу, лепшы доказ клопату беларусаў пра Слова: канструктыўнае, мастацкае, друкаванае, духоўнае – яно здольнае дапамагчы нам захаваць сябе як унікальную еўрапейскую нацыю.

**Наталля КРЫВЕЦКАЯ**
**Фота Валерыя КАРАЛЯ**